*УДК 373.5.016:821.161.3.09*

# ЧЫТАННЕ ЯК ПСІХОЛАГА-ПЕДАГАГІЧНАЯ І МЕТАДЫЧНАЯ ПРАБЛЕМА

**В. Ю. Дылеўская**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. К. Маркса, 31, 220030, г. Мінск, Беларусь, valentinadylevskaja42@gmail.com*

Чытанне як адзін з асноўных этапаў вывучэння мастацкага твора. Уступныя заняткі і арыенціровачная гутарка. Формы правядзення ўступных заняткаў. Чытанне – гэта складаны творчы працэс, які патрабуе ад вучня напружанасці. Чытанне як важнейшы кампанент працэсу літаратурнай адукацыі. Віды чытання ў працэсе літаратурнай адукацыі.

***Ключавыя словы:*** чытанне; уступныя заняткі; арыенціровачная гутарка; высвятленне папярэдніх уражанняў.

# READING AS A PSYCHOLOGICAL AND PEDAGOGICAL AND METHODOLOGICAL PROBLEM

**V. U. Dylevskaja**

*Belarusian State University,*
*K. Marx St., 31, 220030, Minsk, Belarus, valentinadylevskaja42@gmail.com*

Reading as one of the main stages in the study of a work of fiction. Introductory classes and orientation conversation. Forms of introductory classes. Reading is a complex creative process that requires the student's effort. Reading as the most important component of the literary and educational process. Types of reading in the process of literary education.

***Key words:*** reading; introductory classes; orientation conversation; clarification of previous impressions.

Галоўным аб'ектам вывучэння ў працэсе літаратурнай адукацыі з'яўляецца мастацкі твор, а чытанне – важнейшы кампанент гэтага працэсу. Чытанне рэалізуе ў грамадстве адукацыйную, пазнаваўчую, культурную, камунікатыўную, інфармацыйную, прафесійную, займальную і іншыя ролі. У «Філасофскім слоўніку» чытанне разглядаецца як творчая дзейнасць, у выніку якой узнікае новая якасць самога чалавека. Адзін з заснавальнікаў методыкі выкладання літаратуры Ф. І. Буслаеў лічыў чытанне «асновай тэарэтычным ведам і практычнаму ўменню». Ён сцвярджаў, што разуменне фундаментальнай ролі чытання ёсць

адзінае бясспрэчнае палажэнне педагогікі, настойваў на асэнсаваным прачытанні [1, с. 12].

Вывучэнне мастацкага твора складаецца з чатырох асноўных этапаў: уступныя заняткі, чытанне, аналіз і заключныя заняткі. Кожны этап уключае ў сябе розныя віды дзейнасці вучняў. Этапы не з'яўляюцца строга размежаванымі, наадварот, яны ўзаемадзейнічаюць адзін з адным і пераходзяць адзін у другі [2]. «На ўступных занятках патрэбна стварыць устаноўку на чытанне і ўспрыманне тэксту, матывацыю наступнага аналізу і стварэнне арыенціраў успрымання: арыенціроўка у жанры і агульным характары твора, у месцы і часе дзеяння, у сістэме вобразаў і падзей, у эмацыянальных адносінах аўтара да персанажаў» [2, с. 82]. У змест уступных заняткаў можна ўключыць паведамленне біяграфічных і гістарычных звестак, якія будуць неабходны для разумення тэксту, розныя віды каментарыяў. Папярэднічае чытанню ўступнае слова настаўніка, падрыхтоўчая гутарка з вучнямі, разгляд ілюстрацый, экскурсіі.

Формы правядзення ўступных заняткаў з улікам роду і жанру вывучаемага твора: уступнае слова, лекцыя настаўніка, гутарка, работа з падручнікам ці з кантэкстнай літаратурай, кінаўрок, экскурсія і інш.

Пасля ўступных заняткаў часам праводзіцца арыенціровачная гутарка, каб праверыць засваенне зместу твора. Можна выкарыстаць розныя віды пераказу, а таксама складанне плана. У старшых класах змест уступных заняткаў звязаны з гісторыяй напісання мастацкага твора.

Вылучаюць наступныя віды чытання: слыхавое чытанне – успрыманне мастацкага тэксту з голасу іншых людзей, напрыклад, настаўніка ці ў аўдыязапісе; самастойнае чытанне – чытанне па рэкамендацыі, па ўласным выбары, дамашняе чытанне па прапанаваным настаўнікам спісе; калектыўнае чытанне – чытанне вучнямі маналогаў, дыялогаў, фрагментаў тэксту, якое настаўнік выкарыстоўвае на ўроках літаратуры; выразнае чытанне – набліжана да акцёрскага чытання; пазакласнае (дадатковае) чытанне – чытанне па-за заняткамі па заданні настаўніка з наступным правядзеннем урокаў дадатковага чытання; творчае чытанне – садзейнічае развіццю ўяўлення вучняў; каменціраванае чытанне – каментарый гістарычны, сацыяльны, бытавы, біяграфічны, біблейскі, этнічны (яны выкарыстоўваюцца для ўзмацнення ўспрымання і разумення мастацкага тэксту); аналітычнае чытанне – від чытання, пры якім ставяцца аналітычныя пытанні; чытанне па ролях – выкарыстоўваецца чысцей пры вывучэнні драматычных твораў, нагадвае акцёрскае чытанне для большага разумення і пранікнення ў мастацкія вобразы.

Але ж галоўная праблема заключаецца ўсё ж у заахвочванні да чытання. Не сакрэт, настаўнікі літаратуры адзначаюць, што даволі часта

творы застаюцца непрачытанымі. Якую б форму правядзення заняткаў з прымяненнем сучасных тэхналогій не абраў настаўнік, эфектыўнасць іх будзе малаверагоднай.

На практычных занятках па методыцы выкладання славянскіх літаратур студэнты атрымліваюць заданне: пазнаёміцца з метадычнымі знаходкамі ў правядзенні ўступных заняткаў (агляд публікацый па праблеме); распрацаваць некалькі варыянтаў уступнага этапа ўрока (клас, тэма – на выбар студэнта); прапанаваць варыянт задання менавіта па заахвочванні да прачытання тэксту.

Чытанне – гэта прадмет роздумаў і даследаванняў навукоўцаў, у якіх увага акцэнтуецца ў асноўным на псіхолага-педагагічныя і сацыяльна-метадычныя аспекты чытацкай дзейнасці. Чытанне – гэта складаны творчы працэс, які патрабуе ад вучня напружання, работы інтэлекта, памяці, уяўлення. Узнікае шэраг праблем: 1) педагагічна-псіхалагічная – у школьнікаў затрымліваецца працэс станаўлення тэхнікі чытання; ён завяршаецца к канцу 6 класа; 2) метадычная – дзеці чытаюць мала, няма «цягі да чытання».

Вылучаюць яшчэ і філасофскі аспект праблемы: асобаснае самавызначэнне ў працэсе чытання. Цікавай падаецца думка М. К. Мамардашвілі аб тым, што чытач і пісьменнік ураўнаважаны ў адносінах да тэксту [3, с. 159].

На занятках пры абмеркаванні пытанняў тэарэтычнага блока была звернута ўвага студэнтаў на артыкул В. Ф. Асмуса «Чытанне як праца і творчасць» [4], дзе чытанне разглядаецца як творчасць. «Змест мастацкага твора не пераходзіць <…> з твора ў галаву чытача, Ён узнаўляецца, успрымаецца самім чытачом – па арыенцірах, дадзеных у самім творы, але з канчатковым вынікам, які вызначаецца разумовай, духоўнай дзейнасцю чытача» [4, с. 62].

Для таго каб чытач засвоіў змест мастацкага тэксту, «неабходна, каб у яго ўяўленні ўзнік мастацкі вобраз. Без гэтага ўся далейшая праца па засваенні мастацкага тэксту будзе бессэнсоўнай. Гэты мастацкі вобраз можа быць узноўлены толькі самім чытачом. Калі мастацкі вобраз узнаўляецца па арыенцірах, закладзеных у тэксце, то чытач у першую чаргу павінен умець убачыць гэтыя арыенціры (чытай: мастацкія асаблівасці твора). Мастацкае ўспрыманне – гэта акт пазнання, перажывання і творчасці. Кожны чытач успрымае мастацкі тэкст па-свойму: глыбіня інтэрпрэтацыі абумоўлена ўзроўнем чытацкай культуры» [5, с. 110].

Каб сфарміраваць цікавасць вучняў да чытання, настаўнікі (і бацькі!) павінны ўсвядоміць, што дзеяслоў «чытаць» не мае загаднага ладу. Спецыялісты адзначаюць зніжэнне статусу чытання, змену мадэлі чытання. Сёння мастацкія тэксты чытаюць не толькі з кніжнага ліста, але і з экрана.

На ўроках літаратуры трэба вучыць успрымаць тэкст не як маналог мастака, а зрабіць так, каб чытачы-школьнікі ўступалі ў дыялог з творцам.

Студэнтам было прапанавана адказаць на пытанне і растлумачыць сваю пазіцыю: дзе павінна ажыццяўляцца выхаванне чытача: 1) на ўроках літаратуры; 2) на ўроках па другіх прадметах; 3) у бібліятэцы; 4) у сям'і; 5) ваш варыянт.

У якасці рэфлексіі яны павінны былі ацаніць свой узровень чытацкай культуры; падумаць, што можа эфектыўна паўплываць на яе ўдасканаленне, што дапаможа вырашыць праблему; успомніць і запісаць свой вопыт далучэння да чытання; прывесці прыклады любімых кніг з свайго дзяцінства; ацаніць, якія з іх могуць зацікавіць сучаснага чытача і чаму.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. *Буслаев Ф. И.* Преподавание отечественной литературы. // Методика преподавания литературы: Хрестоматия-практикум: Учеб. пособие для студ. высш. пед. учеб. заведений / Автор-составитель Б. А. Ланин. М. : Академия, 2003.
2. *Богданова О. Ю.* Методика преподавания литературы: Учеб. для студ. пед. вузов / О. Ю. Богданова, С. А. Леонов, В. Ф. Чертов; Под ред. О. Ю. Богдановой. М. : Academa, 2002.
3. *Мамардашвили М. А.* Литературная критика как акт чтения // Как я понимаю философию. М. : Прогресс : Культура, 1992. С. 155–162.
4. *Асмус В. Ф.* Чтение как труд и творчество // Вопросы теории и истории эстетики. М. : Искусство, 1968. С. 55–68.
5. *Романичева Е. С.* Введение в методику обучения литературе: учеб. пособие. М. : Наука, 2012.